ТРАДЫЦЫІ

# Песняру прысвячаецца

**Дзе-дзе, а ў школах Пінскага раёна ўсе ведаюць, што Каласавіны – гэта Якуба Коласа імяніны. І што адзначаюцца яны штогод у народным літаратурна-краязнаўчым музеі Якуба Коласа ў Пінкавічах. Тыя, каму пашанцавала хоць аднойчы ўдзельнічаць у святе, ведаюць, что кожныя Каласавіны маюць нешта эксклюзіўнае…**

Так, надоўга хапіла ўражанняў вучням і настаўнікам нашых школ, якія рыхтавалі летась відэафільмы па тэмах «Новая зямля» і «Сымон-музыка». А лепшыя артысты і рэжысёры былі тады запрошаны на Каласавіны «Пінкавіцкі кінафестываль». Ну, а Каласавіны гэтага года чым адметныя?

«Сэнсацыя! Сэнсацыя! Новай выставы прэзентацыя…» – традыцыйна зазывалі гасцей юныя гідаўцы. А выстава незвычайная! Упершыню ў гісторыі музея ў нас цэлы месяц гасцявалі ўнікальныя экспанаты, звязаныя з асобай Якуба Коласа. Цікава прадставіла экспазіцыю вядучы навуковы супрацоўнік Святлана Цылімава.

Што тычыцца творчасці беларускага песняра, то ў цэнтры ўвагі на гэты раз быў твор-юбіляр трылогія «На ростанях». Тэатралізаваныя ўрыўкі з яе таленавіта прадставілі гледачам вучні Пінкавіцкай і Аснежыцкай сярэдніх школ, якіх падрыхтавалі настаўнікі беларускай мовы і літаратуры Марыя Дудко і Алена Кудзіна. Цікавы сюрпрыз падарыла Марыя Паўлаўна – цудоўнае выкананне песні «Ручэй» на словы Якуба Коласа.

Паэзія Я. Коласа, як вядома, напеўная і мілагучная. Таму ўдзельнікі Каласавін з задавальненнем выконвалі песню-гімн малой радзіме «Мой родны кут...», словы якой ужо другое стагоддзе кранаюць да слёз і выхоўваюць любоў да роднай зямлі. А яшчэ гасцям былі прапанаваны цікавыя гульні, фрагменты экскурсій. Па добрай традыцыі напрыканцы свята ўсе выконвалі любімую песню славутага песняра «Чаму ж мне не пець…»

Вы не патрапілі сёлета да нас на Каласавіны? Не турбуйцеся. Мы робім усё, каб кожная экскурсія ў нашым музеі стала сапраўдным святам роднага слова, якое проста і прыгожа ўвабрала ў сябе творчасць Якуба Коласа. Прыязджайце, не пашкадуеце!

*Жанна* **ВЕРЫЧ,**
**метадыст аддзела адукацыі Пінскага райвыканкама**